Дні духоўнай культуры Расіі і Беларусі прайшлі ў Мінску. У Нацыянальным мастацкім музеі і Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі расійскія спецыялісты правялі майстар-класы, прысвечаныя рэстаўрацыі і кансервацыі кніжных помнікаў, музейных прадметаў і калекцый. Сярод знакавых праектаў Дзён духоўнай культуры — выстаўка «Святыні старажытнага Ноўгарада — святло, якое дайшло праз стагоддзі» ў Нацыянальным гістарычным музеі (будзе працаваць да 25 кастрычніка) і канферэнцыя, прысвечаная культурна-гістарычнаму і духоўнаму скарбу краін, якая адбылася ў Нацыянальным мемарыяльным комплексе «Храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню Айчыны нашай».